# Нашыя аўтары

**Алексіевіч Сьвятлана** — празаік, драматург, публіцыст. Аўтар дакументальна-мастацкіх раманаў «У вайны не жаночы твар», «Цынкавыя хлопчыкі», «Чарнобыльская малітва» і інш. Лаўрэат літаратурнай прэміі «Трыумф». Нарадзілася ў Івана-Франкоўску на Украіне. Зараз жыве ў Германіі.

**Асташонак Алесь** — драматург, празаік, перакладчык, кінасцэнарыст. Аўтар кнігі прозы «Фарбы душы», п'есы «Камедыянт». Нарадзіўся ў 1954 г. у Менску. Зараз жыве на Украіне.

**Арлоў Уладзімер** — празаік, паэт, эсэіст, гісторык. Аўтар кніг «Добры дзень, мая шыпшына», «Дзень, калі ўпала страла», «Рэквіем для бензапілы», «Фауна сноў», «Крыж Ефрасіньні Полацкай», «Дзесяць вякоў беларускай гісторыі» (у сааўтарстве з Г. Сагановічам), «Сны імператара» і інш. Нарадзіўся ў 1953 г. у Полацку. Жыве ў Менску.

**Багданава Галіна** — празаік, мастацтвазнаўца. Аўтар кніг прозы «Папяровыя замкі», «Чалавек без адраса», «Дом іхняе мары». Нарадзілася ў Крычаве на Магілёўшчыне. Жыве ў Менску.

**Берасьцень Сьвятлана** — крытык, музыказнаўца. Больш за дваццаць гадоў піша аб здабытках і праблемах беларускай музыкі. Працуе ў тыднёвіку «Літаратура і мастацтва». Нарадзілася і жыве ў Менску.

**Брыль Янка** — народны пісьменьнік Беларусі. Празаік, перакладчык, публіцыст. Лаўрэат Джяржаўнай прэміі СССР (1952 г.), Дзяржаўнай прэміі БССР (1982 г.), Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1963 г.). Аўтар кніг «Апавяданні» (1946 г.), «У Забалоцці днее» (1951 г.), «Птушкі і гнёзды» (1964 г.), «Жменя сонечных промняў» (1965 г.), «Я з вогненнай вёскі» (1975 г.), у сааўтарстве з А. Адамовічам і У. Калесьнікам) і інш. Нарадзіўся ў 1917 г. у Адэсе. Жыве ў Менску.

**Васілеўскі Пётра** — публіцыст, мастацтвазнаўца. Аўтар шматлікіх артыкулаў па гісторыі Беларусі і беларускага мастацтва, якія друкаваліся ў зборніках і альманахах. Працуе ў тыднёвіку «Літаратура і мастацтва». Нарадзіўся ў 1954 годзе ў Менску. Жыве ў Менску.

**Гайдукова Юлія** — паэтка, мастачка. Скончыла Рэспубліканскі каледж мастацтва, цяпер вучыцца на аддзяленьні мастацкага афармленьня тканінаў і мадэляваньня Беларускай акадэміі мастацтваў. Нарадзілася і жыве ў Менску.

**Галубовіч Леанід** — паэт, празаік, крытык. Аўтар кніг «Таемнасьць агню», «Споведзь бяссоннай душы», «Зацемкі з левай кішэні», «апошнія вершы галубовіча». Нарадзіўся ў 1950 г. у в.Вароніна на Клеччыне. Жыве ў Менску.

**Гілевіч Ніл** — народны паэт Беларусі. Заслужаны дзяяч навукі Беларусі. Прафесар. Паэт, драматург, перакладчык, фальклярыст, літаратуразнаўца. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы (1980 г.). Аўтар кніг «Песня ў дарогу» (1957 г.), «Прадвесне ідзе па зямлі» (1959 г.), «Перазовы» (1967 г.), «Паэтыка беларускай народнай лірыкі» (1975 г.), «Святлынь» (1984 г.), «Родныя дзеці» (1985 г.) і інш. Нарадзіўся ў1931 г. у в. Слабада на Лагойшчыне. Жыве ў Менску.

**Дранько Майсюк Леанід** — паэт, празаік, эсэіст, перакладчык. Аўтар кніг «Вандроўнік», «Тут», «Над пляцам», «Акропаль», «Стомленасьць Парыжам» і інш. Нарадзіўся ў 1957 г. у Давыд-Гарадку. Жыве ў Менску.

**Дубавец Сяргей** — празаік, крытык, публіцыст, выдавец. Аўтар кніг «Практыкаванні», «Дзёньнік прыватнага чалавека», «Русская книга» і інш. Нарадзіўся ў 1959 г. у Мазыры. Зараз жыве ў Летуве.

**Закарыя Фарыд** — публіцыст, палітолаг, галоўны рэдактар уплывовага амерыканскага часопісу «Foreign Affairs». Жыве ў ЗША.

**Захаранка Мікола** — празаік, паэт, публіцыст, драматург. П'еса «Паехалі» (1996 г.) ставілася на сцэне Нацыянальнага тэатру імя Янкі Купалы. Проза і паэзія друкаваліся ў «Полымі», «Літаратуры і мастацтве», «Звяздзе» і інш. выданьнях. Нарадзіўся ў

1949 годзе ў г. Васілевічы на Гомельшчыне. Жыве ў в. Швабы на Лагойшчыне.

**Ірванец Аляксандар (Ірванець Олександр)** — паэт, празаік, драматург. Адзін з лідэраў украінскага літаратурнага постмадэрнізму. П'есы ставіліся ў Кіеве і Харкаве, Лейпцыгу і Штутгарце, перакладаліся на ангельскую, нямецкую, французкую, польскую, харвацкую ды іншыя мовы. Нарадзіўся ў 1961 годзе. Жыве на Украіне.

**Кудравец Анатоль** — празаік, перакладчык, эсэіст. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1986 г.). Аўтар кніг прозы «Зімы і вёсны», «На зялёнай дарозе», «Раданіца», «Сачыненне на вольную тэму», «Сьмерць нацыяналіста» і інш. Нарадзіўся ў 1936 г. у в. Аколіца на Клічаўшчыне. Жыве ў Менску.

**Някляеў Уладзімір** — паэт, празаік, эсэіст. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы (2000 г.). Аўтар кніг паэзіі «Адкрыццё», «Вынаходцы вятроў», «Наскрозь», «Прошча» і інш. Нарадзіўся ў 1946 г. у Смаргоні на Гродзеншчыне. Зараз жыве ў Фінляндыі.

**Пісьмянкоў Алесь** — паэт, эсэіст. Аўтар кніг паэзіі «Белы камень», «Чытаю зоры», «Планіда», «Я не памру, пакуль люблю» і інш. Нарадзіўся ў 1957 г. у в. Іванаўка на Магілёўшчыне. Жыве ў Менску.

**Разанаў Алесь** — паэт, перакладчык, эсэіст. Лаўрэат Дзяжаўнай прэміі імя Янкі Купалы (1990 г.). Аўтар кніг паэзіі «Адраджэнне», «Каардынаты быцця», «Шлях—360», «Вастрыёстралы», «Угорадзе уладарыць Рагвалод» і інш. Нарадзіўся ў 1947 г. у в. Сялец на Брэстчыне. Зараз жыве ў Германіі.

**Рублеўская Людміла** — паэт, празаік, крытык, драматург, нарысіст. Аўтар кніг паэзіі «Крокі па старых лесвіцах», «Адукацыя», «Замак месячнага сяйва», прозы «Міфы горада Б'» і інш. Нарадзілася і жыве ў Менску.

**Рублеўскі Сяргей** — празаік, паэт, публіцыст. Аўтар кнігі прозы «Апостраф». Нарадзіўся ў 1954 г. у в. Бабча на Лепельшчыне. Жыве ў Віцебску.

**Скобла Міхась** — паэт, парадыст, перакладчык, эсэіст. Лаўрэат літаратурнай прэміі імя Алеся Адамовіча (2000 г.). Аўтар паэтычных кніг «Вечны Зьніч», «Вочы Савы», «Нашэсьце Поўні», кнігі гістарычных нарысаў «Дзярэчынскі дыярыюш» і інш. Нарадзіўся ў 1966 г. у в. Паляжын на Зэльвеншчыне. Жыве у Менску.

**Рагін Яўген** — журналіст, публіцыст. У нядаўнім часе супрацоўнік тыднёвіка «Літаратура і мастацтва». Нарадзіўся ў 1960 годзе ў г. Ветка на Гомельшчыне. Жыве ў Менску.

**Сідарэвіч Анатоль** — публіцыст, філосаф, літаратуразнаўца, крытык. Адзін з ідэолагаў адроджанай беларускай сацыял-дэмакратыі. У нядаўнім часе супрацоўнік часопісу «Крыніца». Нарадзіўся ў 1948 г. на хутары Доўгі Лес на Піншчыне. Жыве ў Менску.

**Сітніца Рыгор** — мастак, паэт, публіцыст. Акадэмік Беларускай акадэміі мастацтваў. Творы знаходзяцца ў музеях Беларусі, Польшчы, Грэцыі, у прыватных зборах Беларусі, Летувы, Польшчы, Германіі, Галандыі, Ізраілю, Вялікабрытаніі, Грэцыі. Нарадзіўся ў 1958 г. ў в. Курыцічы на Петрыкаўшчыне. Жыве ў Менску.

**Станкевіч Юры (Харытановіч Георгій Васільевіч)** — празаік, драматург. Аўтар кніг прозы «Луп», «Анёлы на бальшаку», «Армагедон-1895», «Любіць ноч — права пацукоў». Нарадзіўся ў 1945 г. у г. Барысаве на Меншчыне. Жыве ў Барысаве.

**Федарэнка Андрэй** — празаік, драматург. Лаўрэат літаратурнай прэміі імя Івана Мележа. Аўтар кніг прозы «Гісторыя хваробы», «Сінія кветкі», «Шчарбаты талер», «Афганская шкатулка». Нарадзіўся ў 1964 г. у в. Бярозаўка на Мазыршчыне. Жыве ў Менску.

**Чыквін Ян** — паэт, перакладчык, літаратуразнаўца. Доктар філалогіі. Сябра Саюзу польскіх пісьменьнікаў. Піша на беларускай і польскай мовах. Аўтар паэтычных кніг «Іду», «Святая студня», «Неспакой», «Светлы міг» і інш. Нарадзіўся ў 1940 г. у в. Дубічы Царкоўныя на Беласточчыне. Жыве ў Польшчы.

**Шаўлякова Ірына** — крытык, літаратуразнаўца, паэт. Аўтар кніг «Галерэя сноў», «Сентыментальнае паляваньне». Нарадзілася ў г. Чэрвень на Меншчыне. Жыве ў Менску.